© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

У Мінску з'явіцца начлежка (стар. 2)
Заўтра — двухгадовы юбілей Беларускага Хельсінкскага камітэта (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар
Ігар Германчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя
газеты СВАБОДА
Наклад 90.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Пятніца, 31 кастрычніка 1997 г. № 121 Кошт свабодны

Гэта не перамога, а толькі тайм-аўт

Так расцэньваюць у журналісцкіх колах той факт, што «верхняя палата» адхіліла папраўкі ў закон аб друку і вярнула іх на дапрацоўку ў «ніжнюю палату».

Як вядома, і прэзідэнт Лукашэнка адмоўна выказаўся наконт гэтых паправак. Рыгоравіч нават заявіў: *«Я заўсёды лічыў і лічу, што ў нармальным дэмакратычным грамадстве павінен прысутнічаць плюралізм думак, у тым ліку і на старонках друкаваных выданняў»*. Па словах прэзідэнта, у Беларусі са свабодай прэсы ўсё ў парадку. І, як піша БелТА, *«за доказамі хадзіць далёка не трэба: любое апазіцыйнае выданне, у тым ліку і СВАБОДУ, можна набыць у кіёску прэзідэнцкай адміністрацыі»*. Аднак пры гэтым нічога не паведамляецца пра перашкоды, якія чыняцца недзяржаўным выданням. У прыватнасці, нашай газеце па-ранейшаму не даюць дазволу друкавацца ў Беларускім доме друку, нам выстаўляюць штрафныя санкцыі за неіснуючыя парушэнні, нашых журналістаў затрымлівае міліцыя падчас асвятлення падзеяў (дэманстрацый і інш.), нас пастаянна цягаюць у пракуратуры і заводзяць абсурдныя крымінальныя справы «за клевету на президента», «разжигание», «призывы» і г.д. Такім чынам, праблема не толькі ў папраўках.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

Супраць Шарамета сведчаць бомж і глуханямая

З кампетэнтных крыніцаў сталі вядомыя некаторыя падрабязнасці крымінальнай справы супраць Паўла Шарамета і Дзмітрыя Завадскага. Гэтыя дэталі яскрава дэманструюць, як брыгада гродзенскіх следчых даказвае «злачынствы» расійскіх тэлежурналістаў.

У прыватнасці, у якасці асноўнага сведкі фігуруе беспрацоўны Н., які, аказваецца, у той дзень «выпадкова» збіраў грыбы якраз побач з участкам мяжы ў Ашмянскім раёне, праз які «праскочыў» у Літву Павел Шарамет са сваім апаратарам. Бомж клянецца, што бачыў на свае вочы, «як усё было». Заўважым, што раней прадстаўнікі ўлады ніколі не згадвалі пра сведкаў «злачынства», спасылаючыся толькі на відэаматэрыял, зняты групай ОРТ.

Гэты матэрыял таксама не пакінулі без далейшай увагі. Следчыя доўга думалі, што рабіць з тым кавалкам відэастужкі, дзе голасу журналіста не чуваць, а гучыць закадравы тэкст дыктара, — і вось нарэшце прынялі творчае рашэнне. Стужку паказалі «эксперту» —глуханямой жанчыне, якая «умее чытаць па вуснах». Яна ўважліва паглядзела, як рухаюцца вусны Паўла Шарамета, і цяпер ведае, што ж ён там казаў у камеру на працягу ўсяго рэпартажу з беларуска-літоўскай мяжы. З нямых словаў Шарамета нібыта вынікае, што ён стаяў на літоўскай зямлі — і, такім чынам, злачынна перасек беларускую мяжу, прычым двойчы.

Невядома толькі, як гэтыя «доказы» будуць правяраць суддзі, якім выпадзе няшчасце разглядаць справу групы ОРТ. Хіба што самім трэба будзе навучыцца разумець па вуснах, каб пераканацца, што «эксперт» не хлусіць. Во гэта будзе сапраўднае **«галоснае слуханне»** судовай справы!

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Беларусь – краіна разводаў

У Беларусі — самы высокі сярод краін СНД паказчык скасаваных шлюбаў.

Як сведчыць міністэрства статыстыкі і аналізу, у 1996 годзе колькасць разводаў у Беларусі склала 4,2 выпадкі на 1.000 чалавек (у суседніх Расіі і Украіне гэтая лічба склала 3,8). За студзень—жнівень 1997 года гэты паказчык у Беларусі яшчэ ўзрос і склаў 4,6 выпадкаў на 1.000 чалавек.

БелаПАН

Беларуска-расійскі раман.
Пахаладанне ў адносінах Масквы і Мінска — з'ява часовая. Расія не збіраецца скасоўваць шлюб з Беларуссю. Пройдзе час, і беларускага прэзідэнта зноў будуць прымаць у расійскай сталіцы як дарагога госця. Так лічаць маскоўскія аналітыкі (чытайце матэрыял на стар. 5)

«Святыя Дзяды, хадзіце сюды!»

Па ўяўленнях нашых продкаў, памерлыя не адыходзілі зусім у нябыт, а пераходзілі ў іншы стан існавання, адкуль маглі ўплываць на жыццё сваіх родзічаў, дапамагаць ім альбо шкодзіць. Сувязь з продкамі можна было падтрымліваць, выконваючы пэўныя рытуалы, трымаючыся ўсталяваных звычаяў. Гэтыя абрады былі добра распрацаваныя нашымі продкамі, калі нават праз стагоддзі пасля прыходу хрысціянства шмат што засталося ад тых звычаяў. Сапраўдны сэнс абрадаў у асноўным забыты, але ж людзі прытрымліваюцца іх, давяраючы свайм продкам, бо — «не мы прыдумалі, не нам і перайначваць!»

На працягу года ёсць шмат дзён, у якія прынята адзначаць Дзяды — памінаць продкаў. Адзначаюць і стрэчаньскія, і спасаўскія, і піліпаўскія Дзяды. Звычайна гэта бывае ў суботу пасля тых ці іншых хрысціянскіх святаў. Вось найбольш значныя з іх: вясновыя Дзяды — пад Масленіцу — «снеданне па радзіцелях», летнія — пятроўскія — «абед па радзіцелях», і восеньскія — «вячэра па радзіцелях». Таксама памінаюць Дзядоў і на Каляды. А на Тройцу асобна памінаюць памерлых не свайёй смерцю. Улетку ёсць Стаўроўскія Дзяды, калі памінаюць свойскіх жывёлаў, прыгаворваючы: «Стаўры, Гаўры, гам — хадзіце к нам».

Найбольш важныя — восеньскія Дзяды. У многіх мясцовасцях іх адзначаюць у суботу пасля Зьмітра, тады іх называюць Зьмітраўскія. Могуць быць і іншыя дні — напрыклад, першая ці другая субота пасля Пакрова. Бывае і так: у чацвер памінаюць памерлых дзяцей, у пятніцу — жанчын, а ўжо ў суботу — мужчын свайго роду.

На Дзяды рана раніцай ідуць на могілкі, папраўляюць магілы, пакідаюць на іх сімвалічныя пачастункі нябожчыкам. Асобным чынам на восеньскія Дзяды адбываецца памінанне тых, хто памёр у мінулым годзе («пры́кладні»). Тады магілу абкладаюць дзірваном, а напярэдадні ходзяць на могілкі «падглядаць»: раскладаюць вогнішча ў нагах нябожчыка, спальваюць на ім венік. Цікава, што падобны абрад ёсць і ў Літве.

Хоць за дзедавай вячэрай часта плачуць ды галосяць, усё ж Дзяды — гэта свята, хоць і не вясёлае, але ўрачыстае. На Дзяды прыбіраюць хату, убіраюцца самі, гатуюць стравы да радзіннай бяседы. Звычайна гэта бываюць аладкі і куцця з маслам, грыбы, рыба. Сеўшы за стол, гаспадар заклікае да стала і дзядоў, напрыклад: «Святыя дзяды, хадзіце сюды!». На асобны сподак адкладаюць па лыжцы кожнай стравы і адліваюць гарэлкі ў асобны кілішак — дзядам. За вячэрай распавядаюць розныя гісторыі — кшталту такога, як нехта задрамаў вечарам на Дзяды і чуў праз сон, як прыйшлі дзяды на вячэру (праз комін), а дзядзька Пятрок не мог улезці, бо не пускаў хамут, што ён украў пры жыцці. Дарэчы, комін пакідаюць нанач адчыненым, а са стала не прыбіраюць да заўтрага.

У розных мясцінах абрады і час Дзядоў адрозніваюцца, і, відаць, не варта іх уніфікаваць. Усё роўна гэта свята сямейнае, а не афіцыйнае. Выберыце той дзень і звычай, які прыняты на вашай радзіме альбо на радзіме вашых бацькоў. А спробы «ўзаконіць» гэты дзень прыводзяць толькі да далейшага разбурэння традыцыі. Нават тыя людзі, якія ўсё жыццё адзначалі Дзяды, цяпер у разгубленасці, бо Дзяды ў іншы дзень, акрамя суботы, — гэта нонсэнс. (Напрыклад, у наступным годзе «афіцыйныя Дзяды» 2 лістапада выпадуць на панядзелак! А вядома, што панядзелак і ў хрысціянскай традыцыі — непамінальны дзень.)

Яшчэ адна загана «афіцыйнасці» — размыванне сэнсу свята. У мінулыя гады ў прэсе і па тэлебачанні, відаць ад недасведчанасці, заклікалі памінаць «ахвяраў рэпрэсіяў» ды «вязняў канцлагераў». А на Дзяды ж памінаюць сваіх *кроўных продкаў* — такі ўжо гэта дзень спрадвеку. Урэшце, нейкія сваякі ёсць у кожнай ахвяры рэпрэсіяў, такім чынам усе будуць памянуты як належыць — індывідуальна, а не па тэлевізару.

Можа каму ўсе гэтыя звычаі пададуцца састарэлымі, але ж Дзяды — добрая нагода з'ездзіць на радзіму продкаў, сабраць сям'ёй, распавесці дзецям пра свой род, дый самім распытацца ў старэйшых. І ў тых, хто жыве ў горадзе, ёсць у вёсцы бацькі, бабулі-дзядулі, іншыя сваякі ці хаця б суседзі. З'ездзіце, спытайцеся, пакуль яшчэ ёсць у каго.

Вінцэсь ЛІПСКІ

Сямён Шарэцкі вярнуўся з Італіі задаволены

Канферэнцыя кіраўнікоў парламентаў краін Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, якая праходзіла ў італьянскім горадзе Трыесце, прызнала Вярхоўны Савет 13-га склікання адзіным легітымным парламентам у Беларусі. За гэта прагаласавалі дэлегацыі Аўстрыі, Грэцыі, Італіі, ФРГ, Польшчы, Чэхіі, Украіны, Малдовы і іншых краінаў, членаў ініцыятывы. Беларусь на канферэнцыі прадстаўлялі старшыня Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі і дэпутат Станіслаў Шушкевіч.

Выступаючы перад кіраўнікамі парламентаў, С.Шарэцкі адзначыў, што *«пасля дзяржаўнага перавароту ў Беларусі падаўлена работа законнага парламента і мясцовых органаў кіравання»*. Яны ператвораны ў *«прыдатак прэзідэнцкіх структураў»*. Па словах спікера Шарэцкага, *«лукашызм, як новы від дыктатарскага рэжыму, імкнецца да абсалютызацыі ўлады»*. Прыкладам пашырэння яго поля дзейнасці з'яўляецца намаганне Лукашэнкі стаць *«прэзідэнтам саюза Расіі і Беларусі»*.

Шарэцкі нагадаў, што дыктатарскія рэжымы напачатку выступаюць пад маскай законнасці. У свой час нават Гітлера называлі Адольфам-законнікам. Аднак «твар дыктатара Лукашэнкі» пачынаюць распазнаваць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

У Трыесце спікер Сямён Шарэцкі меў перамовы з дэлегацыямі Польшчы, Украіны, Малдовы і Аўстрыі, а таксама са спікерам парламента Азербайджана, які быў запрошаны на канферэнцыю ў якасці назіральніка. Кіраўнік украінскага парламента Аляксандр Мароз сказаў, што ў Беларусі адпрацоўваецца мадэль дыктатарскага рэжыму, якая можа перакінуцца на Украіну і іншыя краіны. Новы маршал сейма Польшчы Мацей Пляжынскі выступіў за пашырэнне міжпарламенцкіх сувязяў з Вярхоўным Саветам Беларусі.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

«Опер» многа ведае?

У Магілёве — чарговы надзвычайны арышт, ужо трэці з пачатку тыдня.

Узяты пад варту Валерый Ткачоў — былы супрацоўнік УКДБ Магілёўскай вобласці. Некалькі гадоў таму следчыя органы ўжо высвятлялі, ці мае ён дачыненне да выпадку, калі невядома куды зніклі 28 мільёнаў «чарнобыльскіх» рублёў, але даказаць нічога не ўдалося.

Пасля забойства Яўгена Мікалуцкага праваахоўныя органы Магілёўскай вобласці працуюць ва ўмовах «узмоцненага рэжыму» і павышанай сакрэтнасці, таму афіцыйных версій арышту Валерыя Ткачова няма. Аднак ёсць звесткі, што гэтым разам былому супрацоўніку КДБ В.Ткачову зададуць пытанні нарэшце незаконнага праслухоўвання тэлефонных размоў кіраўніцтва рознага, у тым ліку самага высокага, рангу.

На працягу двух з паловай тыдняў — гэта ўжо пяты гучны арышт у вобласці.

БелаПАН

Удзельнікаў «Вясны-97» судзяць восенню

Учора ў мінскім гарадскім судзе пачаўся працэс над пяццю жыхарамі беларускай сталіцы, якім інкрымінуецца «непадпарадкаванне і супраціўленне» міліцыі падчас разгону дэманстрацыі 23 сакавіка гэтага года.

Рыгору Кійко, Аляксандру Бондараву, Анатолю Сарокіну, Уладзіміру Лыско і Аляксандру Кавалю пагражае турэмнае зняволенне на тэрмін ад аднаго да пяці гадоў, калі суд вырашыць, што яны сапраўды вінаватыя. Між тым многія назіральнікі не сумняваюцца ў апраўдальным прысудзе, калі б была звернута ўвага на нізкую якасць сабраных супраць абвінавачаных доказаў. У якасці прыкладу можна прывесці хаця б вытрымку з абвінавачвання, прад'яўленага Аляксандру Бондараву: *«На праспекце Скарыны разам з групай нявысветленых асобаў аказваў супраціўленне нявысветленым супрацоўнікам міліцыі»*. Няўжо суд пройдзе міма гэтых «нявысветленых» фактаў гэтак жа, як і следства?

Учора разгляд справы быў адкладзены, бо абвінавачаныя запатрабавалі перакладчыка з рускай мовы на беларускую, якога пад рукой не аказалася.

Напачатку працэса ўсе пяцёра таксама адмовіліся ад паслугаў выдзеленых ім адвакатаў з мінскай гарадской калегіі, паколькі лічаць іх *«залежнымі ад дзяржаўнай сістэмы»*. У якасці грамадскага абаронцы адстайваць інтарэсы абвінавачаных будзе адвакат Надзея Дударава, якая ў дадзеным выпадку прадстаўляе Беларускі Хельсінкскі камітэт. Судовае паседжанне адновіцца сення, у пятніцу, у 10 гадзін раніцы.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Мост, які будавалі 58 гадоў

Нарэшце пайшлі людзі і паехалі аўтамабілі па новым мосце праз Бярэзіну ў горадзе Светлагорску.

Першыя палі ў дно ракі былі забітыя яшчэ ў 1939 годзе, але ў савецкія часы мост так і не дабудавалі. Былая вёска Шацілкі моцна разраслася, з'явіўся горад Светлагорск — а праз Бярэзіну з берага на бераг даводзілася перабірацца па пантоннай пераправе.

Даўжыня новага моста 395 метраў, шырыня — амаль 15 метраў. Каб праверыць надзейнасць канструкцыі, мост абсталявалі рознымі датчыкамі і прагналі па ім на розных хуткасці 13 нагружаных КамАЗаў: усё было добра. А ўрачыстае адкрыццё моста адбылося 23 кастрычніка, з Мінска прыехаў сам міністр транспарту А.Лукашоў. Перарэзаўшы чырвоную стужку, ён з групай адказных таварышаў перайшоў на левы бераг Бярэзіны, дзе яго сустрэлі хлебам-соллю-шампанскім.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Праблемы з электрычнасцю

У мінулыя трое сутак у нашай краіне ўзнік дэфіцыт электраэнергіі.

Служба энерганагляду вымушаная адключаць падачу электрычнасці на прамысловыя прадпрыемствы з 8 да 10 і з 17 да 21 гадзіны. Як паведаміў намеснік дырэктара мінскага «Энерганагляду» Вячаслаў Асота, «праблемы ўзніклі з-за перабору ўстаноўленага ліміту». Акрамя таго, расце запазычанасць прадпрыемстваў і калгасаў. Напрыклад, у Мінску і Мінскай вобласці яна складае 1,5 трыльёна рублёў. Толькі 40 працэнтаў насельніцтва аплачвае гэтую паслугу ў тэрмін. На думку спецыялістаў «Энерганагляду», спажыванне электраэнергіі вырасла з-за выкарыстання абагравальных прыбораў у марозныя дні.

Мікола ВАЙТОВІЧ

Сярэдзіча пусцяць у Дом друку?

А.Лукашэнка публічна паабяцаў, што «Народная воля» атрымае магчымасць друкавацца ў Беларусі

Нагадаем, што ўжо больш за год «Народная воля» друкуецца за мяжой, бо кіраўніцтва Беларускага дома друку, які падпарадкоўваецца ведамству Івана Ціцянкова, адмаўляецца аднавіць з рэдакцыяй дамову на друкаванне «НВ». *«Пяць разоў я звяртаўся да прэзідэнта, каб вырашыць гэтую праблему, але нават адказу не атрымаў»*, — сцвярджае галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч. Па ягоных словах, газета нясе вялікія выдаткі, друкуючыся за мяжой. Між тым Аляксандр Лукашэнка, наадварот, упэўнены, што друкаваць газету ў Літве выгадней, таму Сярэдзіч «адтуль яе і возіць».

Нарэшце ў гэтай гісторыі, магчыма, будзе пастаўленая кропка. На сустрэчы з прадстаўнікамі журналісцкіх арганізацый краінаў СНД, якая адбылася ў мінулую сераду, беларускі прэзідэнт паабяцаў «пытанне вырашыць». *«Хай ён друкуе сваю газету ў Мінску і плаціць грошы нам»*, — загадаў Лукашэнка пры шматлікіх сведках — журналістах намесніку кіраўніка сваёй адміністрацыі Івану Пашкевічу, які паслухмяна кіўнуў галавой. Няўжо гэты загад «самога» не будзе выкананы?

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Толькі на пікеце і даведаліся

Пікет пад лозунгам «Супраць палітычных рэпрэсіяў у Беларусі» правяла ў сераду віцебская арганізацыя «Маладога фронту».

Удзельнікі акцыі сабраліся каля цэнтральнай абласной бібліятэкі, дзе працягваўся збор подпісаў за вызваленне Аляксея Шыдлоўскага і Вадзіма Лабковіча, якія ўжо трэці месяц утрымліваюцца ў следчым ізалятары Жодзіна. У руках пікетчыкі трымалі бел-чырвона-белыя сцягі і запаленыя кішэнныя ліхтарыкі, чым адразу прыцягнулі ўвагу прахожых. Многія віцебцы, якія паставілі свае подпісы ў абарону арыштаваных, упершыню пачулі пра іх менавіта падчас гэтай акцыі.

БелаПАН

Рабочыя перамаглі

Забастоўка на мінскім заводзе «Электроніка» дала вынік — адміністрацыя згадзілася павялічыць рабочым зарплату ў два разы.

А ўсё пачалося з галадоўкі, якую аб'явіла адна з работніц завода — Ала Грыбко. Услед за ёй забаставалі рабочыя двух цэхаў, потым да іх далучыліся калектывы яшчэ двух цэхаў. Пад канец трэцяга дня забастоўкі на завод прыбылі прадстаўнікі адміністрацыі прэзідэнта і міністэрства прамысловасці. У выніку перамоваў кампраміс быў знойдзены.

Дамовіліся пра наступнае: з лістапада заработная плата павышаецца да ўзроўню 2—2,5 млн. рублёў (у кастрычніку работнікам заплацілі ўсяго па 800—900 тыс. руб.); будзе распрацаваны графік рэгулярнага павышэння зарплаты ў залежнасці ад павелічэння мінімальнага спажывецкага бюджэту; будзе паведамляцца памер зарплаты дырэктараў і намеснікаў дырэктараў; прэзідэнцкая камісія пачне праверку работы 7 малых прадпрыемстваў, якія займаюцца збытам прадукцыі завода «Электроніка»; тэмпературны рэжым у цэхах будзе адпавядаць норме — не ніжэй за 19 градусаў цяпла.

Ірына ДУБОВІК

Гарачай вады не будзе

З-за таго, што пастаўкі газу з Расіі ў Беларусь скарочаныя, кацельні Гродна тэрмінова пераводзяцца на мазут.

Але мазут таксама даводзіцца эканоміць, таму з гэтай серады тэмпература вады, якая падаецца ў кватэры, зменшаная і ў некаторых дамах ледзь даходзіць да 40 градусаў.

С.А.

Пяць гадоў без Міхася Ткачова

У гэтыя дні спаўняецца пяць год з таго часу, як нас пакінуў выдатны гісторык і грамадзянін, першы лідэр адноўленай беларускай сацыял-дэмакратыі Міхась Ткачоў.

Штогод родныя і блізкія сябры і паслядоўнікі Міхася Ткачова ўшаноўваюць яго памяць, прыходзячы да магілы на Усходніх могілках у Мінску. Сёлета, у пятую гадавіну з дня смерці Міхася Ткачова, жалобная цырымонія пачнецца аб 11-ай гадзіне.

Прэс-служба БСДП (НГ)

У Мінску з'явіцца начлежка

Бяздомных заўважылі

Мінгарвыканкам разам з грамадскай арганізацыяй «Беларускі саюз сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў» плануюць стварэнне ў Мінску часовага прытулку для бамжоў, які будзе афіцыйна называцца «Дом начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства».

Як паведаміла карэспандэнту СВАБОДЫ кіраўнік справаў Мінгарвыканкама Людміла Валодзькіна, адкрыццё Дома начнога знаходжання адбудзецца не раней як праз год, але ўжо сёлета пачне працаваць «рэгістрацыйны пункт» для бяздомных.

Што і як будзе працаваць

Рэгістрацыйны пункт патрэбны ўжо хаця б таму, што ў Беларусі проста не існуе ніякай статыстыкі наконт асобаў без пэўнага месца жыхарства. Нават прыблізнай іх колькасці не ведае ніхто, у тым ліку і праваахоўныя органы. Але ў рэгістрацыйным пункце будуць не толькі ставіць галачкі, але і аказваць дапамогу.

Паводле словаў Л.Валодзькінай, пункт будзе працаваць па наступнай схеме. Спачатку з чалавекам, які туды прыйдзе, правядуць размову — хто ён, дзе жыў, працаваў, ці ёсць сваякі, якія адносіны мае да Мінска і г.д. Атрыманыя звесткі будуць уносіцца ў спецыяльную анкету, а бамжу дадуць даведку аб рэгістрацыі. Плануецца, што «зарэгістраваным» будзе таксама выдавацца пакунак з ежай, талоны на харчаванне (пра гэта ёсць дамоўленасць з Чырвоным Крыжам). Бяздомнаму дадуць магчымасць памыцца і ў выпадку патрэбы акажуць медычную дапамогу.

Акрамя таго — і ў гэтым, бадай, галоўны прагрэс — бамжа накіруюць да пашпартыста, які або адновіць дакументы (нават пашпарт з прапіскай), або выдасць даведку, якая замяняе пашпарт. Такім чынам, у выніку чалавек атрымлівае шанц знайсці нейкую працу і пачаць нармальнае жыццё.

Начлежка будзе адчыненая пазней, у ёй плануецца 60 месцаў. Праходжанне пункта рэгістрацыі будзе ўмовай для атрымання начлегу (трэба ж спачатку хаця б высветліць, што «прэтэндэнт» — не злачынца). Бамжоў будуць пускаць у прытулак толькі начам, да раніцы і толькі цвярозых. Праблема месцаў будзе вырашацца проста: хто раней прыйшоў — той і атрымаў. Праўда, перавагу будуць мець тыя, хто мае даведку або пашпарт. Пакуль невядома, ці будзе за начлежку хаця б сімвалічная плата.

Праз год бамжам не трэба будзе грэцца ў вакзальным туалеце.

Асноўная праблема

Рэгістрацыйны пункт і начлежку маглі б у прынцыпе адчыніць даўно — але «няма адпаведнага памяшкання». Некалькі варыянтаў было адкінута — або з-за нежадання кіраўніка раённай адміністрацыі, або з прычыны пратэсту жыхароў навакольных дамоў, якія, даведаўшыся пра такое суседства, адразу пачыналі пісаць скаргі. Цяпер удалося адшукаць варыянты, але, каб не было эксцэсаў, адрас Людміла Валодзькіна не назвала.

Начлежка размесціцца ў двухпавярховым будынку (побач — бальніца, прыватны сектар, пустка). Сталовая будзе ў іншым месцы. Гэта прыдумана наўмысна — на думку арганізатараў, трэба разнесці ў розныя месцы пункт рэгістрацыі, сталовую і прытулак, каб «бамжы не скапліваліся ў адным месцы».

Побач з прытулкам размесціцца і Цэнтр сацыяльнай адаптацыі асобаў, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. Фактычна гэта будзе інтэрнат для тых, хто вярнуўся з-за кратаў і каму ўжо ніхто не аказвае дапамогі. Цэнтр дасць ім прапіску на паўгода і магчымасць уладкавацца на працу.

Для тых, хто вярнуўся

Цяпер гэты Цэнтр знаходзіцца ў прыёмніку-размеркавальніку, і на 15-20 месцах у інтэрнаце прапісана да 60 чалавек. Некалькі штатных супрацоўнікаў Цэнтра дапамагаюць знайсці працу альбо накіроўваюць у дом інвалідаў. Сёння гэты інтэрнат фактычна знаходзіцца за кратамі, а яго супрацоўнікі — міліцыянты, што, безумоўна, не самы прывабны варыянт для асобаў, якія вярнуліся з турмы.

За кошт бюджэту і дабрачынцаў

Гэтыя праекты — першыя ў Беларусі, і распрацоўшчыкі пакуль не могуць сказаць, колькі будзе каштаваць стварэнне рэгістрацыйнага пункта і тым больш начлежкі. У бюджэце Мінгарвыканкама пакуль на гэтыя патрэбы нічога не прадугледжана.

Аднак, як паведаміла карэспандэнту СВАБОДЫ старшыня «Беларускага саюза сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў» Марына Наранoвіч, планецца, што ў фінансаванні праекта Мінгарвыканкам і Саюз падзеляць выдаткі ў прапорцыі як 3:1. Гарадскія ўлады забяспечаць памяшканне, штатныя адзінкі пашпартыстаў, ахову і г.д. З боку Саюза — фінансаванне набыцця неабходнай тэхнікі, аплата працы рэгістратара, сацыяльных работнікаў. Каб знайсці сродкі, Саюз падаў заяўку ў амерыканскі фонд *Counterpart*, адказу пакуль няма.

Вялікія надзеі ўскладаюцца на дапамогу ад грамадскіх, дабрачынных і рэлігійных арганізацыяў. Так, ужо цяпер Чырвоны Крыж прапанаваў праграму штодзённага аднаразовага харчавання для 60 асобаў без вызначанага месца жыхарства тэрмінам на 6 месяцаў. На думку Людмілы Валодзькінай, на выдзеленыя сродкі можна будзе пракарміць і сто чалавек.

Абяцаліся дапамагчы і евангелісцкія арганізацыі. Пратэстанты згодныя раздаваць абеды і выконваць іншую працу. Адна камерцыйная фірма пералічыла ўжо на патрэбы працы з бамжамі 50 млн. рублёў. Плануецца запрашаць да працы студэнтаў, якія вучацца па спецыяльнасці «сацыяльны работнік».

Як заўважыла Марына Наранoвіч, гэта будзе ці не першым прыкладам сацыяльнага партнёрства — супрацоўніцтва дзяржаўных і грамадскіх структураў на карысць канкрэтных людзей.

Алесь САДОЎСКІ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

На 7 лістапада запалім жалобныя свечкі

Шаноўная рэдакцыя!

Жыве ў Пінску Канстанцін Яўхімавіч Рамановіч, чалавек трагічнага і шчаслівага лёсу. Шчаслівага таму, што мае дружную сям'ю, сяброў і прыяцеляў па ўсёй Беларусі і за яе межамі. Мне нядаўна выпала сустрэцца і пагаварыць з ім. Думаю, многім чытачам СВАБОДЫ будзе цікава прачытаць, што думае гэты 70-гадовы чалавек, якому давялося прайсці сталінскія лагеры, вялікую цану заплаціць за свае патрыятычныя перакананні.

Канстанцін Рамановіч.

Спадар Рамановіч, як ён сам сябе называе, — «ветэран дэмакратычнай арыентацыі». Нягледзячы на свой паважны век, 70 гадоў, актыўна працуе: распаўсюджвае літаратуру, збірае подпісы і матэрыяльна падтрымлівае ініцыятывы мясцовых дэмакратычных арганізацыяў.

Першы раз яго, 17-гадовага навучэнца Наваградскага педвучылішча, арыштавалі за прыналежнасць да Саюза беларускай моладзі (СБМ). Асуджаны «особым совещанием» на 3 гады пазбаўлення волі. Другі раз арыштаваны ў 1947 годзе — за стварэнне падпольнай беларускай арганізацыі «Саюз Вызвалення Беларусі». Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

У 1956 годзе вярнуўся на Беларусь. Здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю, працаваў інжынерам-будаўніком. На сённяшні дзень Кастусь Яўхімавіч — сябра Асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій, сябра БСДП (Народная Грамада), актывіст ТБМ.

— Большасць беларусаў не верыць у сваю Бацькаўшчыну, сваю Беларусь, — з жалем гаворыць К.Рамановіч. — Тое ж і апазіцыя: яна да гэтага часу раз'яднаная, а раз'яднаных лёгка перамагчы.

Я ўвогуле не лічу сябе палітыкам, хоць з 17-ці гадоў цярпеў «за палітыку». Хутчэй назавуся маўчуном: у лагеры маўчаў, пасля вызвалення таксама маўчаў. Але заўсёды трымаў у сэрцы веру і надзею.

— Звычайна лічаць, што старэйшыя заўсёды незадаволеныя моладдзю. А новае пакаленне беларускіх патрыётаў — якое яно?

— Я не з тых, хто скардзіцца на моладзь. Маладыя людзі, што імкнуцца процістаяць уладзе, мне вельмі падабаюцца. Можа, іх не так многа, як хацелася б... Але тыя, хто ёсць, выяўляюць свой пратэст не на ўзроўні пустых эмоцый, а ў свядомай працы, мэта якой — дэмакратычная беларуская дзяржава. І таму цяперашні рэжым імкнецца іх задушыць, запалохаць. Прыклад — Вадзім Лабковіч і Аляксей Шыдлоўскі, якіх ужо два месяцы трымаюць у турме.

— Ці падтрымліваеце Вы сувязі са сваімі старымі сябрамі-адзінадумцамі?

— Абавязкова. Сябрую з тымі, з кім разам крочыў па этапах ГУЛАГа. На жаль, іх няшмат засталося — восьмы дзесятак гадоў разьмянялі. Але мы захавалі актыўную грамадзянскую пазіцыю — у шэрагах БНФ, Грамады, у калонах дэманстрантаў і на пікетах. Нас, былых палітвязняў, напалохаць цяжка. Кожны з нас пранёс праз усё жыццё любоў да Беларусі і зрабіў тое-сёе ў імя гэтага.

— Дзень кастрычніцкай рэвалюцыі — ізноў дзяржаўнае свята на Беларусі, а сёлета яшчэ і 80-гадовы юбілей. Што б Вы напісалі ў віншавальнай паштоўцы?

— З нагоды гэтай даты я нікому віншавальнай паштоўкі не пашлю. Гэта не свята — гэта жалобны дзень. У гэты дзень я прапаную, як на Дзяды, запаліць свечкі і памянуць мільёны ахвяраў камуністычнага рэжыму. Ушанаваць іх памяць хвілінай маўчання.

І сапраўды, няхай кожны адзначыць гэты дзень так, як яму падкажа сумленне, — хто з чырвоным рэвалюцыйным сцягам на мітынгу, а хто з жалобнай свечкай.

Настасся ШАЙБАК,
г.Пінск

Ищите лидера!

Хороший специалист – не значит хороший политик

Вот уже можно услышать, что из молодежи появляется лидер и кандидат в президенты. Что ж, пока молод и неопытен, но в этом и есть плюс. У него еще есть время дозреть и, действительно, через десять-пятнадцать лет пойти на штурм этой должности (если к тому времени такая должность и такое государство будут существовать).

Да, уважаемые господа лидеры оппозиции. Первую ступеньку рейтинга Лукашенко занимает до сих пор только потому, что никто из вас не может претендовать на это место.

Вы пришли в демократию только после 85-го, когда стало можно, а до этого многие напряженно строили коммунизм, да и если осуждали руководящий режим, то только на кухне или там, где закрываются изнутри.

Даже такая целенаправленная организация, как БНФ — и та оказалась неподготовленной возглавить демократический процесс в республике из-за незрелости ее лидеров. Хотя, что скрывать: ставка была сделана именно на нее. Но, странное дело, никто из них даже не подумал поискать опыта среди бывших диссидентов, которые все-таки были у нас, вопреки тиражируемому мнению. Более того, имели место случаи, когда отказывались от предлагаемой помощи. Дескать, «мы лепш ведаем, мы больш дасведчаныя». История еще скажет об этом.

В августе 1991 года, после путча, я приехал в Минск и, застав митингующую толпу на крыльце здания бывшего ЦК, обратился к присутствовавшим фронтовцам: «Не нужно терять время здесь, сегодня власть бесхозная. Давайте повернем колонну к Дому правительства, соберем больше людей и потребуем от Верховного Совета создания переходного правительства и парламента без коммунистов и зажравшихся номенклатурщиков. В противном случае силой народа сместим Верховный Совет и создадим временные органы власти». «Ды ты што, — ответили они, — гэта ж будзе дзяржаўны пераварот. Мы ніколі на гэта не пойдзем. Мы возьмем уладу толькі канстытуцыйным шляхам, народ сам усё зразумее і аддасць нам уладу». «Власть не отдают, власть берут. Вы еще почувствуете это», — ответил я.

После августа 1991 года прогрессивные политические силы решительно сказали свое слово в странах Балтии, в ряде других республик, а в Беларуси они предпочли мелочную суету настоящим действиям.

Так была утеряна реальная возможность изменить ход политических событий в республике. Пришедший на смену Дементею Станислав Шушкевич не сумел поднять власть с земли и окончательно упустил инициативу оправившейся номенклатуре. После этого к власти мог прийти только такой специфический человек, как Лукашенко.

Вторым переломным моментом в республике мог стать октябрь-ноябрь прошлого года. И люди собирались на площади, и начинал потихоньку разбегаться лукашенковский совмин, а руководитель разгоняемого парламента С.Шарецкий уговаривает собравшихся разойтись: «Мы не нуждаемся в вас, ибо имеем достаточно средств, чтобы защитить демократию».

Я не стал бы хвалить и позицию, занятую в те дни Белорусским народным фронтом. Но это уже тема другого разговора. Отсутствие взаимопонимания и единства между демократическими силами позволило Лукашенко одержать верх, а Россию заставило принять его сторону.

После событий ноября 1996 года я спросил: «Почему вы призывали людей разойтись с площади Независимости, почему не призвали народ и вооруженные силы к защите парламента и наведению конституционного порядка, как это было в Москве 1991 года?» — «Я бы сразу оказался в тюрьме», — ответил государственный муж.

А вот то, что в тюрьме впоследствии оказались многие его сторонники — как бы и неважно. Так и получается, что все это время к власти в республике идут политические трусы, подставляя тем самым под милицейские дубинки достойных и честных граждан.

Господа из демократической оппозиции! Почти каждый из вас является специалистом своего дела, но никто не годится на роль лидера. Прекратите бессмысленное состязание, объединитесь, невзирая на социал-демократо-бэнэфовские различия, и ищите единого лидера среди масс! Им может оказаться совершенно неожиданное для вас лицо.

В противном случае действительно придется ждать десятки лет, пока подрастут молодые ребята.

Я.НОВИЦКИЙ,
г.п. Лиозно,
Витебская область

Два лісты да прэзідэнта

Не рызыкуйце...

Мне 30 гадоў. Жыву я ў раёне Шабаны, што на ўскрайку Мінска. На выбарах я галасаваў за Вас, Аляксандр Рыгоравіч. Напрыканцы Вашай перадвыбарчай прамовы я нават плакаў. Як гэта ўсё проста на першы погляд — злачынцаў пасадзіць, заводы запусціць, узровень жыцця падняць! Але потым Вашыя дэкрэты ды ўказы пачалі рабіць усё наадварот. Праца нічога не каштуе, і калі б не невялічкі агародзік, можна было б зусім загнуцца з голаду.

Дзе ж стабілізацыя, інвестыцыі, пашырэнне вытворчасці і павелічэнне занятасці насельніцтва? Няўжо Вы не бачыце, як старыя людзі, што калісьці працавалі на дабрабыт нашай з Вамі краіны, цяпер жабруюць? А хлопцы, што калісьці разам са мной скончылі школу, цяпер нідзе не працуюць, а толькі п'юць, здабываючы грошы крадзяжамі.

Вы адгарадзіліся ад народа шматлікай аховай, рознымі там спецслужбамі, сістэмамі кантролю. Але ўсё гэта, хоць і каштуе дорага, можа не спрацаваць...

Я ўяўляю сабе, колькі нерваў забірае ў Вас навязлівая ідэя бачыць паўсюды шпіёнаў, што імкнуцца забіць Вас. Магчыма, Вы цяжка засынаеце кожны раз, а Вашая ахова пільна правярае на атруту харчы ў Вашай кухні. Пакуль што сістэма спрацоўвае, але... А бронекамізэлька, якую Вы пастаянна носіце (пра гэта я чытаў у расійскіх газетах), закрывае не ўсё цела, а толькі да пояса...

Аляксандр Рыгоравіч! Напрыканцы свайго ліста да Вас хачу сказаць Вам як чалавек чалавеку: Вы яшчэ малады, не рызыкуйце сваім здароўем і сваім жыццём! Пакіньце свой пост! І гэта будзе лепшае, што Вы можаце зрабіць для сябе і для Беларусі!

А падпісваюся я проста —

СЯЛІЦКІ,
г.Мінск

Пока еще верят...

Уважаемый президент!

Обратиться к Вам нас вынуждают чрезвычайные обстоятельства. Мы — женщины, мы с 16–18 лет пошли на заводы, рожали и вновь выходили к станку. И вот сейчас кому 30, кому 40, кому 50, и с каждым годом нам жить все труднее и труднее. В газете читаем, что средняя заработная плата у нас в стране более 2.500.000 рублей. Откуда взялась эта цифра? Может быть, это заработная плата администрации или работников исполнительной власти? Почему тогда у женщин, работающих на промышленных предприятиях, заработная плата не достигает и миллиона? Может, Вы как глава государства подскажете, как прожить на эти деньги семье, чтобы дети не голодали?

На улице мороз и такая же температура в цехах: руки к железу примерзают. Женщины работают в таких условиях! Мы, рабочие и работницы, голосовали за Вас. За нас, женщин, Вы поднимали новогодний тост. Вы обещали, что Ваша главная цель — это забота о человеке. Но где все это?

Для того, чтобы получить мизерную заработную плату и добиться тепла на рабочем месте, женщины на некоторых предприятиях идут на крайние меры: объявляют голодовки, останавливают производство. Сегодня такое произошло на Минском заводе «Электроника», а завтра может случиться и в других местах.

Александр Григорьевич, есть ли у Вас сердце? Как Вы допускаете, чтобы дети голодали, а здоровье женщины калечили? Многие мужчины свои проблемы топят в водке. Что делать нам и нашим детям — тоже пить? Женщины пока еще верят Вам — так не лишайте себя их доверия, ответьте, выполните свои обещания.

По поручению работниц Минского завода «Электроника» зам. председателя Белорусской организации трудящихся женщин
Мария АЛИЕВА

РАДКІ З ЛІСТОЎ

ОДНАЖДЫ, ЕЩЕ В БРЕЖНЕВСКИЕ ВРЕМЕНА, допрашивавший меня сотрудник КГБ говорил:

— Я не понимаю, почему ты так стоишь за них, за белорусов. Ведь ты фактически русский человек... Если бы вдруг белорусам предоставилась возможность создать свое суверенное государство... Нет-нет, конечно, это чисто теоретическое предположение: Советский Союз будет стоять незыблемо — это понятно каждому образованному человеку. Но если предположить — в этом случае белорусы все равно не сумеют построить свое государство, они не договорятся между собой, переругаются и попадут в чью-то зависимость. У прибалтов получится, русские тоже смогут, хохлы кое-как, белорусы же — никогда. Они слишком осторожные, как евреи, но у последних хоть есть деловая жилка, а у этих — ничего, кроме трусости.

С Советским Союзом у него, конечно, промашка вышла (это уже другая история), а вот остальное... Как бы мне хотелось, чтобы он ошибся и в остальном!

М.Н., *г.Минск*

НЯДАЎНА Я ЕХАЎ на электрацягніку. Быў стомлены пасля працы, паклаў галаву на калені і заснуў. Прачнуўся, калі нехта моцна ткнуў мяне ў бок некалькі разоў. Я ўбачыў трох міліцыянтаў, якія злосна глядзелі на мяне. Двум з іх, відаць, было толькі па дваццаць гадоў. Яны падумалі, што я п'яны.

Не, мне не крыўдна за тое, што давялося даказваць, што я не п'яны. Крыўдна за тое, што гэтых зусім маладых хлопцаў з залатымі літарамі «К» на пагонах начальства і выкладчыкі міліцэйскай акадэміі не вучаць этыкету. Сёння ён ткнуў дубінкай у бок — а заўтра ўдарыць безабароннага. Хіба можна давяраць такой міліцыі?

Віктар СВІРС, *г.Мінск*

Солидное предприятие использует солидные компьютеры.

Почему предпочтительнее покупать PC у фирмы «SKY SYSTEMS»?

Есть вещи, на которых нельзя экономить.
Есть вещи, которые не заставят нас жалеть о сделанной покупке.
Есть вещи, которые нужны нам как воздух.
И эти вещи – мощные современные компьютеры от фирмы «SKY SYSTEMS».

Вашему вниманию предлагаются самые последние модели, которые отличаются быстротой и надежностью.

Работая на этих компьютерах, Вы получите возможность забыть, что такое незапланированный ремонт.

Работая на этих компьютерах, Вы будете экономить драгоценные секунды, которые вскоре обернутся часами и днями.

Зная, где купить эти компьютеры, Вам не придется тратить время на излишние поиски.

Итак, возьмем краткую выдержку из фирменного прайс-листа. Здесь и готовые компьютеры – для тех, кто доверяет вкусу наших специалистов. Здесь и богатый выбор комплектующих – для тех, кто привык делать все сам. Оптимальная конфигурация – вот что является нашей с Вами целью. Профессиональные советы и дельные предложения – и вот перед Вами компьютер, идеально соответствующий специфике Вашей работы.

Рекомендуем выбрать как базу процессор Intel Pentium 160-200 с системой MMX. Модули памяти SIMM 16-64 Mb – в зависимости от надобности. Если Вы имеете дело с графикой – пожалуйста: отличные мониторы SONY и SAMSUNG 17", если же компьютер Вам необходим для другого – обратите внимание на 15-дюймовые модели.

Особый подход к компонентам мультимедиа. С ходу выделим несколько безусловных «хитов»: 12-16-скоростные CD-ROM Cyberdrive (удачное сочетание цены и эффекта), новинка – 24-скоростные *CD-ROM* TEAC для истинных гурманов, привыкших использовать только самое лучшее. Звуковые платы – у Вас просто разбегутся глаза, но не теряйтесь: советуем недорогие SB Pro 2 16 bit stereo, а среди них – Idema ESS 1688 по смешной цене 16 у.е., работающая на ЛЮБОМ компьютере. Добавим сюда еще активные колонки мощностью 160-240 W (35-65 у.е.).

Обязательно стоит обратить внимание на факс-модемы (от 14400 до 36600 Bps).

Ну, конечно, и принтеры – струйные (от 175 до 365 у.е.), лазерные (от 333 до 475).

Да, не забудьте записать адрес и телефоны фирмы «SKY SYSTEMS» – и тогда Ваша мечта воплотится в реальность на земле!

г.Минск, ул. Кульман, 1, корп. 15, тел./факс 239-33-15, 232-13-90.

Семен Марков, РИА «АПАШ»

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Заўтра — двухгадовы юбілей Беларускага Хельсінкскага камітэта

Чалавек мае права...

Хельсінкскі рух узнік пасля Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе ў 1975 г., калі дзяржавы-ўдзельніцы абавязаліся захоўваць на сваіх тэрыторыях правы чалавека. Пазней гэты рух ператварыўся ў Федэрацыю Хельсінкскіх камітэтаў. Сябрам гэтай Федэрацыі з'яўляецца сёння і Беларускі Хельсінкскі камітэт.

Старшыня БХК Таццяна ПРОЦЬКА з'яўляецца, так бы мовіць, фізікам і лірыкам у адной асобе. Яна скончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, выкладала на гэтым факультэце, а пасля абараніла дысертацыю па тэме «Філасофскія праблемы прыродазнаўства» і атрымала ступень кандыдата філасофскіх навук. Цяпер працуе ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Мае дзвюх дачок.

Пасля вядомага выпадку, калі Іван Ціцянкоў публічна разарваў бел-чырвона-белы сцяг і раздаваў кавалкі гэтага сцяга са сваімі аўтографамі, Таццяна Процька (тады яшчэ не старшыня Хельсінкскага камітэта, проста як грамадзянка Беларусі) звярнулася ў пракуратуру з патрабаваннем узбудзіць крымінальную справу па факту знявагі дзяржаўнай сімволікі. Але атрымала цынічны адказ: маўляў, гэта была не знявага, а «ўтылізацыя зношанага палотнішча». «Тады я зразумела, што адна не здолею змагацца», — кажа Таццяна. І ўзначаліла ініцыятыўную групу па стварэнні Беларускага Хельсінкскага камітэта, куды ўвайшлі пісьменнікі (Р.Барадулін, С.Алексіевіч, В.Тарас), урачы, гісторыкі, мастакі, журналісты (у тым ліку П.Шарамет). 1 лістапада 1995 г. БХК быў афіцыйна зарэгістраваны ў міністэрстве юстыцыі. Такім чынам, заўтра — двухгадовы юбілей Беларускага Хельсінкскага камітэта.

— Галоўнай статутнай мэтай Хельсінкскага камітэта з'яўляецца абарона правоў чалавека ў Беларусі, — гаворыць Таццяна Процька. — За гэтыя два гады, што існуе БХК, становішча з правамі чалавека ў нашай краіне сапраўды змянілася, але зусім не ў лепшы бок.

Правы чалавека парушаліся і тады, але ніхто з нас і ўявіць сабе не мог, што мы пабачым на ўласныя вочы тое, што адбываецца сёння. Тады да нас прыходзілі літаральна па некалькі чалавек у месяц. Сёлета колькасць скаргаў штомесяц складае сотні. Таму наша арганізацыя пашырылася. Цяпер мы маем моцны інстытут назіральнікаў і 8 аддзяленняў у буйных гарадах Беларусі.

— Дзяржаўныя чыноўнікі часта абвінавачваюць праваабарончыя арганізацыі і апазіцыйных палітыкаў у тым, што яны сваёй дзейнасцю шкодзяць прэстыжу і інтарэсам Беларусі на міжнароднай арэне.

— Сапраўдныя патрыёты Беларусі хочуць, каб гэта была моцная ў эканамічных і палітычных адносінах дзяржава, роўная сярод роўных, якая разумее і прымае сістэму сучасных каштоўнасцяў, дзе людзі жывуць шчасліва і спакойна, без страху.

Я лічу сябе патрыёткай Беларусі. Таму я хачу, каб нашыя грамадзяне былі роўныя амерыканцам і еўрапейцам, каб наша краіна не была вырадкам у сусветнай супольнасці.

— Прынцып цывілізаваных краінаў — прыярытэт правоў чалавека перад інтарэсамі дзяржавы.

— Тое, што адбываецца цяпер у Беларусі, карэнным чынам адрознівае нашу краіну ад цывілізаваных краінаў. Сёння ў нас пануе не сіла закона, а закон сілы. У грамадстве няма ўяўлення, што трэба жыць па законе. Нашыя людзі, плануючы свае дзеянні, глядзяць не на закон, а на свае сувязі і магчымую рэакцыю начальства — ад прэзідэнта да кіраўніка па рабоце. Законы, Канстытуцыя — пусты гук для людзей, сваіх канстытуцыйных правоў яны не ведаюць і не цікавяцца імі, бо ўпэўненыя, што тое, што гарантуе ім Канстытуцыя, ніколі не будзе выконвацца. Закон сілы ўвайшоў не толькі ў свядомасць, але і ў падсвядомасць людзей. Цывілізаваныя дзяржавы адрозніваюцца ад нас перш за ўсё тым, што там перад законам усе роўныя — і прэзідэнт, і селянін, і хто хочаш. У нас, наадварот, усе ведаюць, што за адно і тое ж суддзя аднаго засудзіць, другога адпусціць, а ў трэцяга справа наогул да суда не дойдзе. Уяўленне пра правы чалавека ў Беларусі адсутнічае, пачынаючы ад прэзідэнта, які не разумее, што такое правы чалавека і які прыярытэт яны маюць перад інтарэсамі дзяржавы, і да апошняга селяніна, які наогул не ведае, што гэта такое.

— Селяніну гэта, можа, і даравальна. Але калі чалавек палез на вышэйшую пасаду — да яго ўжо іншыя патрабаванні. Вышэйшая ўлада павінна з'яўляцца прыкладам захавання правоў чалавека — замест гэтага яна дапускае нават не тое што страшэнныя парушэнні законаў, а проста ганьбаванне права як такога.

— Так, гэта і ёсць беларуская адметнасць: тыя, хто павінны абараняць закон, — галоўныя парушальнікі.

— Па тым, што вас затрымалі ў саўгасе «Рассвет», бачна, што ўлада нават не спрабуе хаця б рабіць выгляд нейкай законнасці — наадварот, яна дэманструе беззаконне.

— Затрымліваць і асуджаць старшыню Хельсінкскага камітэта напярэдадні абмеркавання ў ААН выканання беларускім урадам Пакта аб правах чалавека — гэта вар'яцтва. Але гэта было зроблена, каб простыя людзі наогул дыхнуць баяліся. Маўляў, вунь вашая праваабаронца двое сутак адседзела — а з вамі яшчэ не тое будзе.

— Такім чынам, парушэнні правоў чалавека на палітычным узроўні цягнуць за сабой поўны «беспредел» на ўзроўні побытавым?

— Так. Нашыя г.зв. «праваахоўчая» і судовая сістэмы могуць толькі пакараць чалавека, але ніяк не абараніць яго. Людзі адчуваюць сябе безабароннымі і бездапаможнымі. Дарэчы, тыя скаргі, што сотнямі ідуць у БХК, тычацца зусім не толькі збіванняў падчас мітынгаў: нам пішуць пра жахлівыя ўмовы пражывання, у якіх хварэюць дзеці; пра чарнобыльскія праблемы (дзяржава не дае належнага па законе); па несправядлівых рашэннях судоў і г.д. Мы задаем пытанні ўладам, звяртаемся ў пракуратуру, у службу кантролю — і часам нам удаецца дапамагчы людзям, — але, канешне, далёка не ва ўсіх выпадках. Што тут казаць, калі дзяржава ўжо год існуе без законных органаў улады, па-за межамі прававога поля.

— Што вы думаеце наконт рашэння Вярхоўнага Савета пра наяўнасць прыкметаў злачынства ў дзеяннях Лукашэнкі і пачатку працэдуры імпічмента?

— Грамадства не можа нармальна існаваць без закона — а ў нашым сучасным грамадстве панавання закона няма. У нас няма законнага парламента і, як цяпер канстатавалі дэпутаты, няма і законнай выканаўчай улады. Прэзідэнт парушыў Канстытуцыю, на якой ён кляўся, — і сам ён гэта выдатна ведае.

Рашэнне, якое прыняў Вярхоўны Савет, сведчыць пра тое, што дэпутаты зразумелі: трэба вяртацца ў прававое поле. Мы гэта, безумоўна, вітаем. Форма, якую яны абралі (адхіленне Лукашэнкі ад улады) — гэта ўжо палітычны крок, які я як кіраўнік праваабарончай арганізацыі каментаваць не буду. Я спадзяюся, што, можа, і прэзідэнт знойдзе нейкі шлях вяртання ў прававое поле.

Нам увесь час трэба памятаць: мы не быдла, а людзі, у якіх ёсць правы, і мы павінны іх абараняць. Інакш мы пазбаўленыя будучыні.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

P.S. Тэлефон Беларускага Хельсінкскага камітэта ў Мінску — 239-68-28.

Колесу нужна дорога

Есть несколько величайших изобретений, которые имеют не национальный, а общечеловеческий характер. Среди них — колесо, спиртные напитки и, разумеется, деньги.

Колесо — изобретение техническое, алкоголь — духовное, а деньги —универсальное. Кстати, поэтому у независимой Беларуси тоже появились собственные деньги: отношения товарообмена в нашей стране, как и во всем мире, стремятся быть универсальными.

И чтобы деньги заработали так, как они в принципе могут, им, как и колесу, нужна дорога — рыночная экономика, для которой, в свою очередь, необходима правовая платформа. Как же сделать такую платформу? Именно эти проблемы обсуждали в Минске участники международной конференции «Экономическая политика постсоциалистических государств. Законодательная база экономических реформ». Спонсором конференции выступил фонд Евразия.

Реформу нужно лоббировать

По словам одного из докладчиков, профессора Богданкевича, при наличии у правительства реформаторской воли в стране можно *«проводить политику обеспечения реального экономического роста на здоровой основе»*. В этом случае «белорусское чудо» выражалось бы в показателях не только произведенного, но и проданного, в реальном росте доходов населения на 6—10% в год.

Цель организаторов проекта и заключается в том, чтобы законодательно подготовить такую политику. Первый этап (подготовка проектов законов) уже выполнен, теперь очередь за их экспертизой и лоббированием в коридорах власти. На успех этого мероприятия можно рассчитывать, поскольку среди власть предержащих тоже есть люди трезвые, понимающие необходимость для страны играть по цивилизованным правилам.

В универсальности этих правил убеждает опыт всех наших соседей. Многие хорошо помнят, как в экономическом отношении эволюционировала Польша. Лет 8-9 назад, пользуясь либерализацией режима въезда-выезда и сохранением у нас «социалистических цен», Беларусь наводнили польские «челноки», скупавшие на корню весь ширпотреб, причем и самый дефицитный. Затем в самой Польше дала результат либерализация экономики — и лидерство в стихийном товарообмене взяли на себя белорусские негоцианты. Ныне Польшу уже не удивить белорусским ширпотребом.

Но прежде чем в Польше победила и принесла результаты рыночная экономика, произошел перелом в сознании поляков: общество категорически отказалось от всяких игр с коммунистами, ввиду чего они лишились всякой возможности играть в «обновленный социализм». Свои особенности были в странах Балтии. Поведение большинства населения в этих странах определил феномен, который профессор Александр Потупа называет «антиоккупационным синдромом». Он реализовался в том, что население охотно согласилось с элитой в признании советского режима нелегитимным, а все его законоуложения — незаконными. Поэтому конкретная политика свелась к восстановлению законности в обществе.

Гораздо дальше в направлении рыночных реформ, по сравнению с нами, ушли также Россия и Украина. О России у нас много всякой информации, об Украине пишут меньше, но при всей противоречивости происходящих в этих странах процессов ясно одно: реальностью стала тенденция стабилизации их экономик на здоровой основе, о чем свидетельствует и опережающий рост доходов населения. К слову, в этих странах также срабатывает, если так можно выразиться, национальный синдром.

Визуально это можно было наблюдать, в частности, во время телетрансляции из Киева футбольного матча между «Динамо» и «Барселоной». Согласитесь, собрать полные трибуны 100-тысячного стадиона среди публики, лишенной представления о национальной перспективе страны, было бы невозможным. Нельзя, конечно, сбрасывать со счетов мастерство киевских футболистов, но трудно предположить, что такой же ажиотаж в Беларуси вызвало бы выступление их минских национально индифферентных коллег. В спорте ведь, помимо чисто технических возможностей, большую роль играют качества патриотические.

Бесполезно!

Белорусский синдром

Поэтому, отмечая особенности современного развития Беларуси, можно сказать, что для нашего общества характерен антинациональный синдром, благодаря которому страна заранее занимает проигрышные позиции в отношениях со всеми своими партнерами. Беларусь, пожалуй, меньше всех новых независимых государств известна в мире. Оно и понятно: страна, склонная представлять себя в качестве провинции другой (пускай даже и значимой страны), — особого интереса вызвать к себе не может.

Есть и другие важные аспекты, не лучшим образом характеризующие Беларусь. Один из них — практически полный отказ от земельной реформы. Приверженность руководства Беларуси к колхозно-совхозному строю не поддается рациональному объяснению. Представляется, что тут тоже не обошлось без синдрома. Имя ему — голод. Этот тезис подтверждается самим характером дискуссии по аграрной проблеме, которая развивается в примитивных рамках вопроса: кто накормит страну — колхозник или фермер?

А ведь все дело в том, что ни колхозник, ни фермер страну кормить не обязаны. Решая аграрную проблему, общество должно быть обеспокоено прежде всего тем, чтобы дать крестьянству равные с другими социальными группами права. Сегодня право на «городской» производственный капитал де-юре имеет представитель любой социальной группы (пусть номинально, но чеки «Имущество» выдавали всем, а в крупных городах мало-помалу проводятся аукционы недвижимости). Крестьянин, как и любой гражданин, должен обладать правом иметь в собственности землю — как основной фактор аграрного производства. А как он распорядится своей собственностью — это его дело. Как правило (в чем убеждает и опыт более благополучных стран) крестьяне используют ее для увеличения производства.

Конечно, все это азбука, но даже она пока остается недоступной для белорусского руководства. Причем нежелание расстаться с колхозно-совхозным строем преподносится со ссылками на общественное мнение.

Но если даже общественное мнение и таково, то это не значит, что все должно оставаться так как есть. Ведь настоящее искусство политики не столько в том, чтобы, консервируя ситуацию, как можно дольше оставаться у власти, а в том, чтобы разрушать преобладающую иждивенческую психологию большинства и создавать условия, позволяющие проявлять себя не многим, но лучшим. Тогда можно надеяться, что со временем их — лучших — станет большинство.

Иными словами, кроме мнений и позиций, нужны еще и дела. Нужно строить эту самую дорогу, по которой только и может катиться колесо экономики. И уж, по крайней мере, не загонять его в тупик. Иначе не помогут ни алкоголь, ни деньги.

Константин СКУРАТОВИЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
31 кастрычніка 1997 г., № 121

Взгляд из Москвы

Батька больше так не будет...

При общении с Александром Лукашенко Кремль использует проверенный принцип кнута и пряника

С момента подписания исторического договора о создании союза России и Беларуси прошло полгода. За это время в Минске многое изменилось. Гораздо хуже стало с продуктами, выросли цены, а в начале октября начались перебои с бензином. Бородатый владелец старенького «Опеля» прокомментировал ситуацию следующим образом: «*Завтра наш президент скажет, что Ельцину уже 120 лет, так нас вообще от трубы отключат*». Такие высказывания на улицах столицы Беларуси редкость. И не потому, что мало кто разделяет подобные взгляды. Просто люди боятся — суды исправно штрафуют покусившихся на «честь и достоинство...», а предварительные извещения о «неблагонадежности», направляемые по месту работы еще до судебного заседания, грозят серьезными неприятностями вплоть до увольнения.

Вообще тема взаимоотношений России и Беларуси не слишком беспокоит жителей Минска. Прежде всего в силу того, что заключение союза с Россией на жизни конкретного гражданина Республики Беларусь никак не отразилось: рабочих мест не прибавилось, зарплату не повысили, а цены выросли. Весенние договоренности, предусматривавшие в том числе постепенное сближение жизненных уровней, так и остались на бумаге. Разговоры на тему: «Вот если бы союз работал...» не популярны. Станислав Шушкевич считает, что по-другому и не могло получиться: «*Я не верю в наивность российских политиков. Они наверняка знали, что именно так и произойдет. Лукашенко с самого начала не собирался выполнять условия договора и Устава. Не понимали этого в Кремле? Не верю. Так вот, теперь хорошо бы повиниться некоторым: Строеву, например, или Черномырдину. Это они окрылили диктатора, это они признали законность разгона парламента. А ведь тогда еще можно было повлиять на ситуацию. Сегодня уже сложно. И просто смешно теперь выглядят сетования из Кремля. Ах, оказывается, в Беларуси у власти не демократический режим. Ах, у них не соблюдаются гражданские права. Ах, засадили Шеремета...*»

Уговор дороже денег

Недовольство действиями Лукашенко у Москвы нарастало постепенно в течение нескольких лет. Раздражало в первую очередь игнорирование Минском российских интересов: Беларусь по-прежнему не сравняла свои таможенные пошлины с российскими, нефтяные компании никак не могут получить доступ к акционированию белорусских нефтеперерабатывающих заводов (Лукашенко в принципе противится процессу разгосударствления). Да и российская пресса давно призывала Кремль выступить в защиту политических свобод в Беларуси. И «дело Шеремета» стало подходящим поводом наконец-то проявить характер и «приструнить» союзника, хотя формально корреспондента ОРТ задержали не за вольномыслие, а за вполне конкретное уголовно наказуемое деяние.

Стоит отметить, что и для Лукашенко действия Шеремета были только поводом. Белорусский лидер, приученный Кремлем к тому, что ему сходят с рук любые фортели, решил в очередной раз показать всем, кто в хате хозяин. При этом корреспондент ОРТ был вдвойне удобной мишенью — «батьке» надоело, что по телевизионному каналу, который смотрит вся подведомственная ему страна, его костерят почем зря.

«*В Москве в последнее время очень часто забывают, что Беларусь — суверенное государство. И глава этого государства в отличие, между прочим, от других президентов не живет по сценарию, написанному в чужой стране*, — заявил нам Владимир Заметалин, белорусский вице-премьер. — *Так как же президент должен относиться к постоянным несправедливым нападкам российских СМИ? Когда ваши журналисты рисуют образ диктатора, они не знают, как президент общается с детьми в сиротских домах, как он встречается с ветеранами, как у него капают слезы от обиды за этих людей.... У него натура, как оголенный нерв, и если бы действительно добра желали на ОРТ стрингеру Шеремету и чувствовали бы ситуацию кожей, то совсем бы другие слова нашли.... Если бы Арина Шарапова с ее милой улыбкой сказала бы: «Александр Григорьевич, мы вас очень просим, ну пожалуйста, весь коллектив ОРТ присоединяется, измените меру пресечения Павлу Шеремету», я думаю, это произошло бы мгновенно...*»

Поцелуев больше не будет?

Трогательную тягу к сентиментальным поступкам, характерную для диктатора с «человеческим лицом», Лукашенко проявил уже после того, как Шеремет прописался в изоляторе гродненского управления КГБ. Однако, ожидая в течение трех месяцев смиренного прошения Арины Шараповой, Александр Григорьевич явно передержал журналиста в оковах.

Лаборатория «Новак», которая является отделением Института Галлапа в Минске, провела социологический опрос. В результате выяснилось, что почти 20 процентов населения республики доверяют Шеремету как политику. Таким образом белорусские власти по собственной инициативе взрастили себе на голову новую белорусскую политическую звезду.

Это бы еще полбеды. Но власти Минска незаметно для себя перешли ту границу, за которой Борис Ельцин «открывает огонь на поражение». Человек из ельцинского окружения охарактеризовал конфликт предельно дипломатично: «*В этой истории затронуты вопросы этики взаимоотношения двух президентов*». В действительности Лукашенко позволил себе обманывать российского коллегу и выставил его чуть ли не маразматиком, который не помнит, о чем шла речь во время знаменитой сентябрьской встречи, когда два лидера решали судьбу Шеремета. Кремль мог «не замечать» невыполнение Александром Григорьевичем положений союзного Устава о соблюдении прав человека, мог «не расслышать» его высказываний в адрес членов российского правительства, но откровенного хамства в адрес президента в Москве не прощают.

Кремль испробовал все возможные способы воздействия на Лукашенко: с ним вели переговоры российские министры, сам Ельцин его и уговаривал, и стыдил, и даже угрожал расторгнуть союз. Но Александр Григорьевич либо огрызался, либо вовсе не замечал сигналов из Москвы. В конце концов для белорусского лидера просто закрыли российское небо, пояснив: без ведома Кремля и МИДа негоже наносить визиты в провинцию иностранным президентам. Черту под всей историей подвел опять-таки Ельцин: «*Пусть вначале отпустит Шеремета!*»

И хотя Лукашенко выпустил журналиста на свободу — было слишком поздно. Ельцин перестал ему верить. И, похоже, это недоверие надолго станет определяющим фактором в российско-белорусских отношениях.

Последствия

«*Как нельзя объединить экономические системы Северной Кореи и Южной, как нельзя объединить экономику Флориды и близлежащей Кубы, так нельзя вести, по всей видимости, экономическую интеграцию России и Беларуси, если экономические основы двух стран сильно разнятся*», — это заявление было сделано первым вице-премьером российского правительства Борисом Немцовым в середине сентября в интервью «Белорусской деловой газете». В целом оставаясь сторонником объединения и экономического сближения, Борис Ефимович тем не менее допустил возможность применения Москвой жестких санкций против Минска: «*Вы не можете без российского рынка существовать, поэтому у России есть экономические возможности влиять на ситуацию в Беларуси.... Мы мирные люди, но если в конце концов нас выведут из себя, то придется, конечно, участвовать в различного рода экономических операциях*».

В Москве в то время еще оставались последние надежды на возможность урегулировать конфликт по-тихому. Тем не менее на заявление Немцова в российской столице никто внимания не обратил. Зато в Минске угрозы вызвали беспокойство как у властей, так и у оппозиции, обнаруживших в этом случае удивительное единодушие. Станислав Шушкевич: «*Если экономические санкции со стороны России выльются в прекращение поставок нефти и газа, это грозит катастрофой Республике Беларусь. Предприятия остановятся, а на улицы выйдут голодные и холодные люди. Не думаю, что такой вариант событий устроил бы российские власти. Ведь абсолютно непонятно, к каким последствиям это приведет...*» Вице-премьер Заметалин использует значительно более энергичные формулировки: «*В России есть политические недоросли, которые балуются вентилями нефти- и газопроводов, как детской игрушкой. И вопрос, что произойдет с нашей страной, если эти псевдополитики пойдут на крайние меры, уместно задавать министру по чрезвычайным ситуациям — боюсь, это уже будет в его компетенции. Только некоторым политикам надо помнить, что окно в Европу прорубил Петр, а они сегодня делают нечто противоположное.* (Петр все же «рубил окно» несколько севернее. — **Авт.**). *И этой глупой акцией они просто закроют ворота в Европу. А это — единственные ворота. Ну а то, что реально произойдет, написано в программе Белорусского народного фронта: граница Беларуси и России должна быть обустроена, как раньше — границы СССР; Беларусь в этой ситуации перестанет использоваться как многофункциональный коридор для России, за все Россия должна будет платить: за нефтепровод, за газопровод, за шоссейные дороги, за железные дороги, за воздушное пространство и т.д. Это все стоит очень дорого. Миллиарды долларов. И тогда уже будем считать: кто кому и сколько должен...*»

Пока Россия не собирается перекрывать вентили и ставить барьеры на пути белорусских товаров. В Москве, кажется, надеются, что минские «шалуны» наконец-то испугались, усвоили урок и «больше так не будут». Однако, опасаясь непредсказуемой реакции соседа, те же российские политики, которые поставили Лукашенко в угол, сами же начали Александра Григорьевича из этого угла вытаскивать. Москва стала предпринимать усилия для возвращения союзной державы в семью европейских государств. В первую очередь — в Совет Европы. Главный аргумент был прост — изоляция Беларуси осложняет жизнь только белорусским гражданам, которые не имеют возможности апеллировать к международным правозащитным институтам. Правда, Кремлю так и не удалось добиться возвращения Минску статуса спецприглашенного на сессии СЕ, и Александр Лукашенко так и не поехал на недавний саммит в Страсбург.

Впрочем, отстаивая права Беларуси на международной арене, Россия преследует и собственные интересы: союз с государством, чьи властители откровенно пренебрегают общепринятыми демократическими нормами, не лучшим образом сказывается на российском имидже. Но и пренебрегать стратегическими интересами — коротким, дешевым и надежным транзитным путем на Запад — Россия не собирается. А потому ни о каком разводе Москвы и Минска речи быть не может. Была лишь размолвка, да и то недолгая. Уже на прошлой неделе Александра Лукашенко принимали в Кремле на заседании Таможенного союза и предоставили возможность поработать пресс-секретарем «союза четырех». А пройдет еще месяц, скандал подзабудется, белорусского президента опять начнут принимать в российской столице как дорогого гостя. И так до нового кризиса, до тех пор, пока неспокойный сосед не позволит себе новые выпады в адрес российского коллеги, а Москва, со своей стороны, не решит возобновить воспитательный процесс.

Александр РЫКЛИН,
Дмитрий ПИНСКЕР,
обозреватели журнала «Итоги», Москва

Обоюдоострые доводы

Высокопоставленные чиновники российского МИДа выражают уверенность в том, что, несмотря на политические разногласия, Россия и Беларусь никогда не пойдут на разрыв экономических связей. Если же это произойдет, то в проигрыше окажется в первую очередь белорусская сторона.

Потери Беларуси

По данным Института народнохозяйственного прогнозирования РАН, сокращение в два раза поставок российского газа и нефти в Беларусь вызовет падение ВВП республики на 35%. В России подобное сокращение ВВП произошло за все время экономических реформ.

Беларусь лишится обширного российского рынка, где ее товары ввиду относительной дешевизны нередко имеют конкурентные преимущества, и соответственно львиной доли своего внешнеторгового оборота (55% внешнеторгового оборота Беларуси приходится именно на Россию).

Согласно данным белорусского Министерства сотрудничества со странами СНГ, прирост промышленного производства в Беларуси в этом году составит 15% по сравнению с 2% в 1996-м. Непонятно, насколько можно верить этим цифрам, но расторжение Таможенного союза, установленного между нашими странами в 1995 году, в любом случае сведет на нет рост в Беларуси промышленного производства.

Ну и при желании окончательно завинтить гайки Россия может потребовать немедленной выплаты долга 100 млн. долл.

Потери России

Беларусь — второй по значению (после Украины) торговый партнер России в рамках СНГ. На ее долю приходилось в 1996 году около 20% товарооборота РФ со странами Содружества, к началу 1997 года действовало 467 российско-белорусских СП.

Беларусь гарантирует России устойчивый рынок сбыта нефти и нефтепродуктов (9—10 млн. тонн ежегодно) и газа (до 14 млрд. куб. м ежегодно), сопоставимый по размерам с рынком крупного российского региона. По белорусской территории проходят 2 из 5 основных нефтепроводов из России на Запад, включая стратегический нефтепровод «Дружба». «Прозрачность» российско-белорусской границы заметно снижает тариф на транспортировку нефти (он, к примеру, ниже украинского на 20%).

В случае распада Таможенного союза Россия лишится 800 млрд. руб., ежегодно выплачиваемых Беларусью за совместное использование энергосистемы. 70% российских экспортных грузов, проходящих через Беларусь, подпадает под таможенные пошлины, что, по различным оценкам, будет обходиться России в несколько сотен миллионов долларов в год.

Некоторые виды производимой в Беларуси продукции жизненно важны для российской экономики. Например, до сих пор 80% тракторного парка в России составляют машины, выпускаемые Минским тракторным заводом, в горнодобывающей промышленности России более 40% грузов вывозится автомобилями белорусского производства. В настоящий момент 180 российских оборонных предприятий поддерживают контакты со 120 заводами белорусского ВПК. Доля поставок из Беларуси в оборонном заказе России составляет 15%, причем это главным образом высокотехнологичная продукция: авианавигационные приборы, средства спутниковой и космической связи. По некоторым данным, при разрыве сотрудничества с белорусскими предприятиями на организацию альтернативных производств только в оборонной промышленности России потребуется единовременно около 20 трлн. руб.

Дмитрий ПАВЛОВ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
31 кастрычніка 1997 г., № 121

ФЕСТЫВАЛЬ

«У напрамку да сябе»

З 4 па 10 лістапада ў Мінску пройдзе VII фестываль «Адраджэнне беларускай капэлы». Падобныя фестывалі кожны год, пачынаючы з 1991-га, ладзіць тэатральна-канцэртнае аб'яднанне «Беларуская капэла», якое імкнецца вярнуць слухачам забытыя музычныя скарбы Беларусі, узгадаць славутыя некалі імёны кампазітараў.

Сёлета фестываль прысвячаецца кампазітару Яну Давіду Голанду (1746—1827), які нарадзіўся ў Нямеччыне, але з пачатку 1780-х гадоў жыў і працаваў у Нясвіжы і Вільні. Да нядаўняга часу лічылася, што творы Голанда не захаваліся, але беларуская даследчыца Вольга Дадзіёмава адшукала ў замежных архівах багатыя матэрыялы пра гэтага кампазітара, а «Беларуская капэла» падрыхтавала на іх аснове шэраг канцэртаў.

Напярэдадні фестывалю Вольга Дадзіёмава расказвае чытачам СВАБОДЫ пра свае даследаванні.

Гісторыя еўрапейскай музыкі сведчыць, што працэс фарміравання нацыянальных школаў адбываўся ў XVIII—XIX стагоддзях — якраз у той час, калі Беларусь па аб'ектыўных прычынах не магла стварыць сваю, нацыянальна адметную музычную плынь. Але з гэтага не вынікае, што ў тыя часы ў нас не было сваёй музычнай культуры. Проста гэта была культура-«донар», якая аддавала лепшыя таленты моцнай Польшчы ды імперскай Расіі, культура-«перакладчык», праз пасрэдніцтва якой будаваліся ўзаемасувязі Усходу і Захаду. Вось і атрымліваецца, што нашых кампазітараў — Станіслава Манюшку, Восіпа Казлоўскага, многіх іншых — адносяць да Польшчы і Расіі, адмаўляючы Беларусі ў праве мець сваю гісторыю музыкі.

Я ўпэўненая, што ў дачыненні да нашай краіны павінен працаваць такі прынцып: усё, што стваралася на тэрыторыі Беларусі, — гэта неад'емна нашае. Я называю гэта — рух у напрамку да сябе. Нам трэба пераканаць саміх сябе ў пэўнай «культурнай паўнавартаснасці», пачаць рухацца да свайго мастацкага самаўсведамлення, да саміх сябе. У рэшце рэшт, трэба зразумець, што ў развіцці нашай музыкі не існавала ніякіх правалаў ці «белых плямаў», а была высокапрафесійная культура, да якой, дарэчы, належаў і Ян Голанд.

У Нясвіж Голанда запрасіў Караль Радзівіл (Пане Каханку) у 1782 годзе. Праўда, не ўдалося дакладна высветліць, па якіх прычынах Ян Голанд пакінуў Гамбург, дзе быў вядомы і меў поспех. Я лічу, што, відаць, прапанова нясвіжскага магната была для нямецкага кампазітара і прэстыжнай, і выгаднай у матэрыяльным плане. А як беларускія варункі паўплывалі на творчасць Голанда — можна цяпер меркаваць па адшуканых творах.

Найбольшай увагі сярод шматлікіх твораў Яна Голанда заслугоўвае ягоная опера «Агатка», напісаная ў Нясвіжы ў 1780-я гады і папулярная далёка за межамі Беларусі на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Даследчыкі лічылі, што ноты «Агаткі» страчаныя ў часы Другой сусветнай вайны, але, на шчасце, у адным з Кракаўскіх архіваў знайшоўся рукапіс оперы. Я адшукала яго, аднак нават не спадзявалася, што гэты матэрыял калі-небудзь «загучыць». А вось Віктар Скарабагатаў, убачыўшы ноты, адразу сказаў: «Я гэта спяю!» І «Беларуская капэла» ўзялася за адраджэнне цудоўных твораў Яна Голанда — аднаго з найбольш значных кампазітараў, што працавалі ў Беларусі на мяжы XVIII—XIX стагоддзяў. У гэтым наш поспех, наша радасць, падсумавала Вольга Дадзіёмава.

Раім аматарам музыкі наведаць фестываль «Адраджэнне беларускай капэлы». Канцэрты пабудаваныя па «біяграфічным» прынцыпе: 4 лістапада ў Зале камернай музыкі пройдзе вечарына «Голанд у Гамбургу», дзе будзе прадстаўлены нямецкі перыяд творчасці кампазітара, а таксама прагучыць канцэрт Ф.Э.Баха, які быў з Янам Голандам у сяброўскіх дачыненнях. Бадай, самая цікавая з фестывальных імпрэзаў — «Голанд у Нясвіжы» — адбудзецца ў Нацыянальным мастацкім музеі: відаць, там, пад мармуровай каланадай, публіцы будзе лягчэй уявіць атмасферу прыватнага канцэрта ў магнацкім палацы. У музеі прагучаць урыўкі з оперы «Агатка», кантата «Смелы, мужны Караль Другі» (прысвечаная ўладару Нясвіжа) і дывертысмент для сімфанічнага аркестра.

8 лістапада ў Зале камернай музыкі адбудзецца канцэрт «Голанд у Вільні» — прысвячэнне гораду, у якім кампазітар жыў з 1802 года і да самай смерці. Там ён выкладаў ва універсітэце, там напісаў «Акадэмічны трактат пра сапраўднае мастацтва музыкі» і шмат музычных твораў. Яны і ўвайшлі ў праграму канцэрта, а таксама ў гэты вечар можна будзе пачуць музыку Міхала Клеафаса Агінскага і Напалеона Орды.

На ўсіх трох канцэртах вы сустрэнецеся з ансамблем «Класік-авангард». Дарэчы, творы Яна Голанда будуць гучаць у інструментоўцы Уладзіміра Байдава, мастацкага кіраўніка «Класік-авангарда». Усе тэксты вакальных твораў перакладзеныя на беларускую мову У.Мархелем і В.Сёмухам.

Завершыцца фестываль канцэртам з фартэпіянных твораў Яна Голанда і ягонай дачкі Яны, які адбудзецца 10 лістапада ў Каледжы пры Беларускай акадэміі музыкі (пл.Свабоды, 7). Слухачам спадабаецца ўся фестывальная праграма, бо яна пабудаваная на цікавым матэрыяле, дый сама музыка Яна Голанда — яскравая, лёгкая — заваюе яму шмат новых прыхільнікаў.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Тры аўтобусы музыкі

У Еўропе заканамерна расце цікавасць да беларускага музычнага мастацтва. Замежныя імпрэсарыо з радасцю запрашаюць на гастролі нашыя мастацкія калектывы — і днямі тры аўтобусы павезлі музыкаў Акадэмічнага сімфанічнага аркестра на далёкі Пірэнейскі паўвостраў — у Іспанію.

Акадэмічны сімфанічны аркестр, які ў наступным годзе адзначыць сваё 70-годдзе, толькі за апошнія гады выступаў з канцэртамі ў Францыі, Італіі, Галандыі, Германіі... Але асабліва любяць нашых музыкаў у Іспаніі, дзе слухачы ўжо добра іх ведаюць і заўсёды радыя кожнай новай сустрэчы. Прыватная музычная фірма «Адэмарт» заключыла з нашым калектывам кантракт на правядзенне дзесяці канцэртаў. Яны праходзяць з 29 кастрычніка па 9 лістапада ў Севільі, Гранадзе, іншых гарадах.

БелаПАН

НОВИНКА СЕЗОНА
Турфирма «ЯРХО»
Автотур «Русский Париж»
продолжительность — 8 дней:
Минск – **Прага** *(1 день)* – **Париж** *(3 дня)* – **Берлин** *(1 день)* – **Минск**.
Обширная экскурсионная программа.
Тел. (017) 235-17-42
г.Минск, ул. Захарова, 31, оф. 102
Приглашаем к сотрудничеству
Лиц. МСТ № 165/1, 26.09.96 – 26.09.98

АФІША

Сапраўдныя гастролі маскоўскага тэатра

Апошнім часам артысты славутых тэатраў Расіі прыязджаюць да нас ненадоўга і паказваюць беларускай публіцы ў асноўным монаспектаклі, падрыхтаваныя адмыслова для правінцыйных турнэ. На жаль, «ударным» момантам падобных імпрэзаў з'яўляюцца не самі спектаклі, а толькі гучныя імёны выканаўцаў. І вось, нарэшце, сапраўдныя гастролі: у Мінск прыязджае МХАТ імя Горкага (мастацкі кіраўнік — Таццяна Дароніна). Спектаклі пройдуць у Доме афіцэраў, пачатак — а 19-й гадзіне, квіткі каштуюць 40—50 тысяч рублёў. 6 лістапада можна паглядзець «Зойкіну кватэру» паводле Міхаіла Булгакава, 7-га — п'есу Педра Кальдэрона «Дама-невідзімка». Пра далейшы расклад гастроляў МХАТа раскажа наступная «Афіша».

ТЭАТРЫ

Урачыстая падзея адбудзецца 31 кастрычніка ў Тэатры оперы і балета — тут пройдзе юбілейны вечар, прысвечаны 50-годдзю мастацкага кіраўніка Беларускага балета Валянціна Елізар'ева. У гонар юбіляра пройдуць ягоныя пастаноўкі — «Вясна свяшчэнная» і «Карміна Бурана». Дарэчы, «Вясну свяшчэнную» можна будзе паглядзець і 5 лістапада. Беларуская опера прапануе паслухаць «Яўгенія Анегіна» (1 лістапада), «Князя Ігара» (4 лістапада) і «Травіяту» (6 лістапада).

Тэатр імя Янкі Купалы запрашае 31 кастрычніка паглядзець «Касцюмера», 1 лістапада — «Ажаніцца — не журыцца» (Вялікая сцэна) і «Крывавую Мэры» (Малая сцэна), 3-га пройдзе «Смерць Кандзіда Тарэлкіна», а 5 і 6 лістапада — «Ідылія». У Рускім тэатры пройдзе 1 лістапада «Свабодны шлюб», 2-га — «Хрыстос і Антыхрыст», 4-га — «Мадам, месье і...», 5-га — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці», 6-га — «Адзіны спадкаемца».

«ЗАЛАТЫ ШЛЯГЕР»

У Магілёве і Мінску праходзіць фестываль «Залаты шлягер» з удзелам папулярных у 70-80-я гады эстрадных выканаўцаў. У сталічнай канцэртнай зале «Мінск» можна сустрэцца са славутым гуртом «Машына часу» (31 кастрычніка), паслухаць Надзею Кадышаву (4 лістапада) і Р.Ларэці (5 лістапада). Трэба адзначыць даволі ўмераныя кошты квіткоў — напрыклад, каб паглядзець на Ларэці, які ў дзяцінстве быў сусветнай знакамітасцю, трэба аддаць ад 60 да 200 тысяч. А галоўныя імпрэзы «Залатога шлягера» яшчэ наперадзе.

ВЕЧАРЫНЫ

У Доме літаратара 4 лістапада а 18-й гадзіне міжнародны фонд «Беларускі кнігазбор» сумесна з Саюзам пісьменнікаў робіць вечар-прэзентацыю з нагоды выхаду чарговага тома Залатой бібліятэкі Беларусі — «Выбраныя творы» Вацлава Ластоўскага. Газета СВАБОДА ўжо анансавала гэтае выданне. У вечарыне возьмуць удзел Ніл Гілевіч, Кастусь Цвірка (галоўны рэдактар «Беларускага кнігазбору»), даследчык Іван Саверчанка, укладальнік тома Язэп Янушкевіч і іншыя. Вядучы вечарыны — Янка Саламевіч. Уваход вольны.

Памяці кінарэжысёра Віктара Турава прысвячаецца імпраза, якая пройдзе 2 лістапада ў Касцёле Сімяона і Алены. У выкананні аркестра «Калегіум Музікум» прагучыць музыка Чайкоўскага і Віла-Лобаса. Пачатак а 19-й гадзіне, кошт квіткоў ад 30 да 100 тысяч рублёў.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Два лісты ў жыцці Якуба Коласа

Паслязаўтра — дзень дзядзькі Якуба. 115 гадоў таму, 3 лістапада 1882 г., нарадзіўся слаўны пясняр беларусаў Якуб Колас.

Пра Якуба Коласа, ягоныя творы напісана сотні розных дысертацый, выдадзена манаграфій і кніг. Але Колас — волат, і ўсяго да канца пра яго проста не скажаш. У апошнія гады з'явіліся публікацыі, што сведчаць: дагэтуль многія факты з жыцця і творчасці нашага класіка замоўчваліся — у прыватнасці, пра той крызіс, які ён перажыў у 20-ыя гады, калі зразумеў, што «кавалі ўжо новыя, а ланцугі старыя»; пра ягоную драму ў 30-я, калі ў ягоным доме праводзіліся вобыскі, а жыццё вісела на валаску; пра тое, што ён мусіў часамі пісаць не так, як хацеў; урэшце — пра ягоны пратэст супраць улады напрыканцы жыцця...

Наш суразмоўца сёння — чалавек, які, бадай, найбліжэй і найбольш ведае Якуба Коласа. Гэта — ягоны сын, доктар фізіка-матэматычных навук Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч.

— Міхась Канстанцінавіч, што ж выбухнула ў Коласавай душы ў 1956 годзе, чаму і з чым ён пайшоў у тагачасны ЦК КПБ? Ягоны перадсмяротны ліст доўга быў невядомы публіцы...

— Бацька не проста доўга, а вельмі доўга выношваў задуму напісаць ліст у ЦК КПБ. Яго, хто поплеч з Янкам Купалам на пачатку стагоддзя ствараў беларускую літаратурную мову, глыбока хвалявала, што і пасля XX з'езда КПСС, калі скончылася чорная сталіншчына і многае ў савецкім грамадстве змянілася ў лепшы бок, адносіны да беларускай мовы ў Беларусі зусім не палепшыліся. А бацька, можа, як ніхто іншы, глыбока адчуваў, што мова народа — гэта яго душа, светапогляд, нацыянальны падмурак, сённяшні і заўтрашні дзень нацыі і дзяржавы.

Помню, той ліст быў закончаны 25 чэрвеня 1956 года, а аднесены ў ЦК КПБ 13 жніўня. Колас вярнуўся пасля дахаты, павіншаваў унучку, маю дачку, з днём нараджэння і сказаў, што хоча падняцца на другі паверх, у свой кабінет, дзе ў хуткім часе за рабочым сталом і памёр. Той ліст, што бацька занёс у ЦК, — прапаў. І калі б не копія, то ён мог бы і бясследна знікнуць. А тагачасныя ўлады рабілі ўсё насуперак таму, чаго хацеў Колас, палітыка дэнацыяналізацыі набірала моц.

Праўда, тут, у нас, не асмеліліся зрабіць тое, што ў Маскве ў тым жа 1956 годзе зрабілі з Аляксандрам Фадзеевым. Фадзееў напрыканцы жыцця напісаў ліст у ЦК КПСС, дзе патрабаваў, каб нарэшце перасталі кіраваць літаратурай неадукаваныя партыйныя чыноўнікі. А калі пазней па пэўных прычынах ён скончыў жыццё самагубствам, то яго, «самага пралетарскага і партыйнага», не пашкадавалі, абвясцілі чорным алкаголікам. Коласа не маглі абылгаць, ягоны аўтарытэт у народзе быў вельмі вялікі, але з ім паступілі інакш — фактычна скралі ягоны ліст.



Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч.

— Перадсмяротны ліст Вашага бацькі ў ЦК КПБ не вырашыў таго, на што быў разлік. А ці былі лісты, што ратавалі жыццё Якубу Коласу? Скажам, такое сцвярджалася пра ліст былога першага сакратара ЦК КПБ Панамарэнкі да Сталіна, у якім ён нібыта выступіў у абарону Купалы, Коласа, іншых пісьменнікаў.

— Гэта — легенда самога Панамарэнкі і тых несумленных літаратараў, якія былі блізкія да яго. У нас былі апублікаваны многія лісты і іншыя матэрыялы наконт таго ж Панамарэнкі. Дык вось, мы ўведалі не зычлівы, а жахлівы ягоны ліст Сталіну, дзе ён паклёпнічаў на Якуба Коласа і Янку Купалу, абзываючы іх «нацыянал-фашысцкімі недабіткамі», пытаўся, што з імі рабіць. Расказвалі, што Панамарэнка, прыехаўшы да нас, у Беларусь, вывучаў беларускую мову, гісторыю і культуру. Мабыць, гэта было так, але цяпер мы ведаем: ён вывучаў не каб развіваць, а каб дабіць.

Дарэчы пра «нацыянал-фашызм». Цяпер, дзякуй Богу, гэты ярлык не ўжываецца. Але ўсё роўна нацыяналізм падаецца як нейкае вялікае зло. А між тым пачытайце філосафаў, скажам, Ільіна альбо Бярдзяева: нацыяналіст — гэта чалавек, які шчыра любіць свой народ, родную мову, гісторыю і культуру і гатовы ахвяраваць да іх сваім (менавіта сваім!) жыццём. У бацькоў нас трое сыноў: Даніла быў хімік, Юрка хацеў быць географам, я — матэматык. І мы — нацыяналісты ў гэтым сэнсе. Такімі выхаваў нас бацька.

Гутарыла
Людміла ЧАПРОЎСКАЯ

КНІГАРНЯ

Новая кніга пра Гарэцкага

Кнігу пра жыццё і творчасць выдатнага беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага падрыхтавалі і выпусцілі супрацоўнікі Горацкага краязнаўчага музея.

У гэтым выданні надрукаваныя каля 100 рэдкіх фотаздымкаў, публікуюцца ўспаміны тых, хто добра ведаў майстра беларускага слова, жыў і працаваў побач з ім. Акрамя таго, у кнігу ўключаныя матэрыялы аб літаратурным музеі Максіма Гарэцкага, які знаходзіцца ў вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага раёна, на малой радзіме пісьменніка.

Іван ЗАСАДА

Мы – не прыблудамі ў сусвеце

У «выдавецтве дзядзькі Язэпа» выйшла кніга пад назвай «Жывом». Яе аўтар, Аляксей Каўка, у пачатку 80-х працаваў саветнікам амбасады СССР у Польшчы, быў прадстаўніком Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі. Потым, ужо напрыканцы 80-х, працаваў у Маскве галоўным рэдактарам часопіса «Советское славяноведение». Ён быў сярод стваральнікаў Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф.Скарыны. Аляксей Канстанцінавіч і сёння жыве ў сталіцы Расіі.

У кнізе А.Каўка паўстае прад намі ў дзвюх іпастасях: як літаратурны крытык і публіцыст. Акрамя аналізу нешырока вядомых старонак творчасці Я.Купалы, ёсць артыкулы, прысвечаныя Зосьцы Верас, Францішку Багушэвічу. Праецыраванне вершаў, напісаных у пачатку стагоддзя, на сённяшні дзень надае ім новае гучанне, прыводзіць да высновы: шмат што змянілася ў свеце за апошнія сто гадоў, а праблемы беларусаў засталіся па сутнасці тымі ж самымі. Нам усё яшчэ бракуе самасвядомасці, а права «людзьмі звацца» ніхто нам на талерачцы не паднясе.

Публіцыстыка прадстаўленая артыкуламі рознага часу — напісанымі 10 гадоў таму і зусім нядаўна. Заканчваецца кніга вершам А.Каўкі, прысвечаным Славаміру Адамовічу, калі той знаходзіўся ў засценках КДБ. Слова з апошняга радка і дало назву кнізе:

На волю птушка рвецца з клеці,
Бязмежжам Млечны Шлях дрыжыць...
Мы — не прыблудамі ў сусвеце —
Жылі. Жывом. І будзем жыць!

Ігар АНДРЭЙЧАНКА

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПАНЯДЗЕЛАК 3 ЛІСТАПАДА

БТ
07.30 Утренний коктейль. **07.45, 17.55** «Музыкальная обойма». **07.50** Мульт-фильм. **08.00** Резонанс. **08.50** «Телебарометр». **09.00** Здоровье. **09.20** «Краски земли родной». Киноочерк. **09.30, 17.45** Экономикст. **09.40** Мультфильм. **10.00** Темная комната. **10.25** Музыкальный салон с Элеонорой Езерской. **11.05** «Скандальное происшествие в Брикмилле». С.1. **12.10** Творцы. **13.00, 15.00, 18.00, 23.50** Новости. **13.10** «Голоса». Киноочерк. **13.20** Творческий вечер А. Ярмоленко. **15.15** Видеокурс немецкого языка. **15.35** Мультфильм. **15.50** «Времена года. Георгины и яблоки». В/ф. **16.15** На добрый лад. **16.30** Гости в доме. **17.00** Музыкальный антракт. **17.10** Творцы. **18.15** «Скандальное происшествие в Брикмилле». Х/ф. С.1. **19.20** Тема дня. **19.40** Актуальное интервью. **20.05** Криминальная хроника. **20.25** «Кто это?» Телеигра. **20.30** Музыкальный антракт. **20.40** Колыбельная. **21.00** Панорама. **21.50** «Рожденная революцией». Х/ф. **23.20** Концертный сезон. **24.00** KBH.

ОРТ
08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 00.10 Новости. **08.15** «Девушка по имени Судьба». **09.00** «Поле чудес». **10.00** Здоровье. **10.30** Угадай мелодию. **14.20** Мультсериал. **14.45** Марафон-15. **15.05** Звездный час. **15.40** «Космическая полиция». **16.05** «...До шестнадцати и старше». **16.30** «100 лет приключений». **17.20** «Девушка по имени Судьба». **18.00** Погода. **18.10** Час пик. **18.35** Угадай мелодию. **19.00** «Мы». **19.45** «Спокойной ночи, малыши!». **20.00** Время. **20.40** Программа передач. **20.45** «Полтергейст-2». **21.45** Л. Зыкина в серии «Жизнь замечательных людей». **22.20** Запрещенный фильм братьев Васильевых «Оборона Царицына». **00.20** Программа передач.

КАНАЛ «РОССИЯ»
07.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. **07.20, 23.15** Дежурная часть. **07.35** «Океан». **08.20** Лучше не бывает. **08.30** Деньги. **08.50** Торговый дом. **08.55** Товары — почтой. **09.05** «Санта-Барбара». **13.20** Деловой автограф. **13.25** «Ти-маркет» представляет. **13.30** На пороге века. **14.00** Теннис. **16.20** Православный календарь. **16.25** «Санта-Барбара». **17.15** Прогноз погоды. **17.20** Лукоморье. **17.40** «История одного события». **17.55** «Океан». **19.25** Подробности. **19.45** Национальный интерес. **20.20** «Я сама». Х/ф. **21.50** Мой Пушкин. **22.20** Вовремя. **22.25** Добрый вечер. **23.30** Теннис. **24.00** Лестница в небо.

КУЛЬТУРА
